# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ АЛЬМАНАХА «ПРЫДНЯПРОЎЕ»




**У першай палове гэтага месяца ў чытальнай зале бібліятэкі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання ў рамках інфармацыйнага часу адбылася прэзентацыя альманаха паэзіі і прозы «Прыдняпроўе-2016. Магілёўшчына літаратурная». Выданне ажыццёўлена Магілёўскім абласным аддзяленнем грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» пры садзейнічанні КВУП «Інфармацыйнае агенцтва «Магілёўскія ведамасці». Укладальнік Уладзімір Дуктаў, старшыня Магілёўскага аддзялення грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі».**

У час свайго выступлення Уладзімір Дуктаў адзначыў, што альманах паэзіі і прозы «Прыдняпроўе-2016» змяшчае новыя творы членаў Магілёўскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання. Яны часта друкуюцца на старонках газет «Магілёўскія ведамасці» і «Магілёўская праўда».



На сустрэчы са студэнтамі прысутнічаў член Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Кунцэвіч, які працаваў карэспандэнтам у рэдакцыі магілёўскіх газет «Прыдняпроўская ніва» і «Веснік Магілёва». Ён жыве ў Магілёве, выпусціў кнігі вершаў «Зваротныя масты», «Горкая спакуса», «Одинокий дождь», «Гул у звоне». Віктар Кунцэвіч прачытаў моладзі свае вершы: «Такси у Храма», «Есть под ногами твердь земли...», «Паутина», «Вот оно – мое село», «Мы все – поэты», «Семь шагов», «О звездах», «Сон», «Могилев» і іншыя. Віктар Кунцэвіч выступае ў друку і як празаік.

У сустрэчы прыняў удзел член Саюза пісьменнікаў Беларусі, а зараз і член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Аляксандр Косцераў. Супрацоўнікамі бібліятэкі была арганізавана выстава «П… няры зямлі Магілёўскай».

Пісьменнікі падарылі бібліятэ… два альманахі «Прыдняпро… Магілёўшчына літаратурная» … 2015 і 2016 гады.

***Вольга БАГДАНОВ…***

## ПАМЯЦІ ПАЭТЭСЫ